# ПУБЛІЦЫСТЫКА

**І. Я. ПАЛЯКОЎ,**
**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР,**
**Герой Сацыялістычнай Працы**

✦

# ДЭМАКРАТЫЯ СТВАРАЛЬНАЯ

**У апавяданні І. С. Тургенева «Жыцейскае правіла» стары прайдоха павучаў: «Калі вы жадаеце як мае быць насаліць і нават нашкодзіць праціўніку... то папракайце яго ў тым самым недахопе ці загане, які вы за сабою адчуваеце. Абурайцеся... і папракайце!»**

**Гэтыя словы міжволі ўспамінаюцца, калі аналізуеш метады «псіхалагічнай вайны», развязанай супраць сацыялізму правячымі коламі капіталістычнага свету. Пра што ні ішла б размова — палітыку, эканоміку, культуру ці любы іншы бок сучаснага жыцця, — заганы, уласцівыя буржуазнаму грамадству, яны прыпісваюць нам. Ашалелыя імперыялісты, якія развязалі небывалую гонку ўзбраенняў і штурхаюць чалавецтва ў прорву ядзернай катастрофы, убіраюцца ў адзенне міратворцаў, мелюць пра пажаданасць раззбраення, а свае чорныя задумы і справы прыкрываюць міфам аб «савецкай ваеннай пагрозе». Закаранелыя расісты, лінчавальнікі, душыцелі нацыянальна-вызваленчых рухаў абвінавачваюць у шавінізме, нацыяналізме, антысемітызме дзяржаву, дзе ўпершыню ў гісторыі вырашылася спрадвечнае нацыянальнае пытанне, дзе на справе перамаглі дружба і братэрства народаў. Арганізатары палітычных забойстваў, рэакцыйных дзяржаўных пераваротаў, брудных правакацый з самалётамі-разведчыкамі, укрывальнікі фашысцкіх катаў і здраднікаў розных масцей выстаўляюць сябе барацьбітамі з міжнародным тэрарызмам.**

**Крывадушнасць буржуазнай прапаганды не ведае меж. Асабліва моцна крычыць яна аб абароне «дэмакратыі», «свабоды», «правоў чалавека». Не цяжка разгадаць сакрэт яе прыхільнасці да гэтай тэмы. Нашы класавыя праціўнікі хацелі б блакіраваць усё большы ўплыў рэальнага сацыялізму, які паказаў усяму свету здольнасць ствараць умовы для творчай, стваральнай працы народаў, для паскоранага развіцця эканомікі, прагрэсу навукі і тэхнікі, росквіту культуры, паслядоўнага ажыццяўлення прынцыпаў сапраўднай дэмакратыі і гуманізму. Усяляк трэціруючы — у хлуслівых прамовах з універсітэцкіх кафедр і парламенцкіх трыбун, са старонак друку і экранаў тэлевізараў, з дапамогай іншых сродкаў масавай інфармацыі — дэмакратыю новага тыпу, сацыялістычную, яны ў той жа час сіляцца паказаць сістэму палітычнай улады капіталістычных манаполій як узор сапраўднай дэмакратыі.**

**Што б ні гаварылі буржуазныя ідэолагі пра гэтую сваю дэмакратыю, ім не па сіле перарабіць рэчаіснасць. А рэчаіснасць такая (згодна з амерыканскай статыстыкай за 1982—1983 гады): у ЗША 12 мільёнаў чалавек не маюць работы, 6,5 мільёна — заняты няпоўны рабочы дзень, а 3 мільёны беспрацоўных не ўлічваюцца, таму што скончыўся тэрмін дапамогі. Біржа працы — неадымная прыналежнасць кожнага амерыканскага горада. Гэта той самы дом, дзе разбіваюцца сэрцы, бо людзі прыходзяць сюды з надзеяй, а ідуць назад расчараваныя і з трывогай.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«Тым, у каго няма спецыяльнасці,—гаварыў у час перадвыбарнай кампаніі сённяшні галава Белага дома Рональд Рэйган,—мы дапаможам атрымаць яе. Для тых, у каго няма работы, мы створым новыя магчымасці. Тым, хто страціў надзею, мы вернем яе». Гэтыя словы—узорчык прапаганды, разлічанай на лоўлю галасоў выбаршчыкаў. А вось што кажа простая амерыканка Лін Х'юлет, якая папрасіла нядаўна пасведчання на права жыхарства ў СССР: «У ЗША з усіх сіл замоўчваецца самае галоўнае права савецкіх людзей—права на працу. У вас у краіне не трэба штодзень думаць аб тым, як зберагчы галоўнае ў жыцці кожнага чалавека—работу. Колькі сябе памятаю, я заўсёды жыла пад страхам пазбавіцца яе... Я пастаянна трывожылася: што будзе заўтра? Самымі цяжкімі днямі майго жыцця—пра іх мне і цяпер не хочацца ўспамінаць—сталі дні, калі я аказалася беспрацоўнай. Мне ніхто не дапамог тады—нават блізкія».

Так, работа—асноўнае ў жыцці кожнага чалавека. І дэмакратыя была і будзе пустым гукам, калі яна не ахоплівае ўсе сферы жыцця грамадства, і ў першую чаргу яго базіс—вытворчыя адносіны, калі з яе выключаецца асяроддзе, у якім чалавек штодзённа працуе, калі працоўныя адхілены ад кіравання вытворчасцю—вырашальнай сферай чалавечай дзейнасці. У гэтым—адзін з галоўных водападзелаў паміж фармальнай—буржуазнай—і сапраўднай—сацыялістычнай—дэмакратыяй.

Паслядоўны дэмакратызм Савецкай дзяржавы абумоўлены самой яго прыродай, усталяваннем грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці. Працоўныя нашай краіны не толькі вытворцы матэрыяльных даброт, але і іх гаспадары. Адсюль—па-гаспадарску зацікаўленыя адносіны савецкіх людзей да сваёй працы, якія вынікаюць з усведамлення таго, што яны працуюць на сябе і сваё грамадства. Адсюль—вытокі сустрэчных планаў, рабочых эстафет, дагавораў сумежнікаў, руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў, брыгаднага гаспадарчага разліку, асабістых планаў павышэння прадукцыйнасці працы, усіх іншых форм масавага сацыялістычнага спаборніцтва. Нагляднае ўяўленне пра яго шырыню можа даць хоць бы такая лічба: у нашай рэспубліцы толькі ў грамадскім аглядзе эфектыўнасці выкарыстання сыравіны, матэрыялаў і паліўна-энергетычных рэсурсаў штогод прымае ўдзел звыш 1,8 мільёна чалавек. З іх дапамогаю эканоміцца мільярды кілават-гадзін электраэнергіі, мільёны гігакалорый цеплавой энергіі, вялікая колькасць паліва, чорных і каляровых металаў, драўніны, цэменту і іншых матэрыялаў.

Не каліта, не чэкавая кніжка, а мера працы стала пры сацыялізме адзінай мерай грамадскага прызнання заслуг кожнага грамадзяніна. «Грамадска карысная праца і яе вынікі,—запісана ў Канстытуцыі СССР,—вызначаюць становішча чалавека ў грамадстве». Спытайцеся пра самых знакамітых, самых паважаных людзей у любым калектыве—і вам назавуць перадавікоў і наватараў вытворчасці: на Мінскім трактарным—Я. І. Клімчанку, слесара-інструментальшчыка, члена ЦК КПСС, члена бюро Мінскага абкома КПБ, Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага работніка прамысловасці БССР; на Мінскім аўтазаводзе—Я. А. Шуляка, брыгадзіра штампоўшчыкаў, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, члена бюро Мінскага гаркома партыі; у саўгасе «Загальскі» Любанскага раёна—звеннявога І. Р. Сініцкага, поўнага кавалера ордэна Працоўнай Славы; на Магілёўскай фабрыцы шаўковых тканін—В. А. Цярэшчанка, ткачыху, якая абавязалася ў адзінаццатай пяцігодцы выканаць трынаццаць гадавых норм і з гонарам стрымлівае сваё слова.

Немагчымая, проста неверагодная ў буржуазным грамадстве пашана, якой акружаны ў нас людзі працоўнай мужнасці і доблесці—машынабудаўнікі і тка-

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке